УДК 323.1(476) + 94(476) «1920/1939»

# КАНФЕСІЙНЫ ФАКТАР У НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫЦЫ 1920–30-х гг. У БССР

**Альховік Мікалай Канстанцінавіч**
Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле вызначаны ўплыў канфесійнага фактару на нацыянальнае будаўніцтва ў БССР. у 1920–30-я гг. Паказана эвалюцыя савецкай нацыянальнай палітыкі ў адносінах да каталіцкага насельніцтва БССР. Асэнсаваны змены ва ўспрыняцці ўладамі гістарычнай ролі Праваслаўнай царквы на беларускіх землях.*

У пачатку 1920-х гг. савецкая ўлада абвясціла аб рэалізацыі курсу на абслугоўванне насельніцтва на яго роднай мове ў дзяржаўных установах і грамадскіх арганізацыях. Афіцыйныя структуры сутыкнуліся з праблемай этнічнага самавызначэння жыхароў каталіцкага веравызнання. Дадзеныя перапісу 1926 г. лічыліся недакладнымі, бо частка польскага насельніцтва БССР была залічана ў беларусы, частка беларусаў – у палякі [7, арк. 114].

Многія партыйна-савецкія работнікі ў мэтах аказання рэвалюцыйнага ўздзеяння на працоўныя масы Польшчы схіляліся да разгортвання работы сярод каталіцкага насельніцтва з невыразнай этнічнай самаідэнтыфікацыяй на польскай мове. 27 мая 1921 г. на сходзе кіраўнікоў павятовых аддзелаў народнай адукацыі ў Мінску было прынята рашэнне аб арганізацыі польскіх школ у месцах пражывання беларусаў-католікаў. Дзеячы польскага рэвалюцыйнага руху Ф. Я. Кон і Ю.-Б. Ю. Мархлеўскі на IV Кангрэсе Камінтэрна (1922 г.) прапанавалі ствараць польскія аўтаномныя адзінкі ў месцах кампактнага пражывання польскага насельніцтва ў прымежнай паласе СССР. Прынятая ў студзені 1923 г. рэзалюцыя Усесаюзнай нарады сакратароў польскіх бюро ў Маскве паставіла перад бюро на месцах задачу задавальняць просьбы аб адкрыцці польскіх школ, якія зыходзілі ад католікаў, якія не размаўлялі на польскай мове ў штодзённым жыцці [6, арк. 240].

7–12 мая 1929 г. на Усесаюзнай нарадзе работнікаў польскіх бюро былі выкрыты «нацыяналістычныя ўхілы асобных таварышаў», якія праявіліся ў беларусізацыі (украінізацыі) ці паланізацыі жыхароў каталіцкага веравызнання незалежна ад іх жаданняў. Партыйным арганізацыям загадвалася «весці сістэматычна сярод насельніцтва каталіцкага веравызнання растлумачальную работу аб сувязі рэлігіі, мовы і нацыянальнасці». ЦК КП(б)Б прытрымліваўся ўстаноўкі на паступовы перавод на беларускую мову тых школ, якія абслугоўвалі беларусаў-католікаў. Сцвярджалася, што патрэба ў навучанні беларусаў і украінцаў на польскай мове знікне з адміраннем рэлігіі [1, с. 74].

Для дзяцей беларусаў-католікаў быў адкрыты доступ у польскія школы, а таксама ў беларускія школы з выкладаннем польскай мовы [9, арк. 10].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 1931 г. польскія работнікі прапанавалі рэарганізаваць Плешчаніцкі, Уздзенскі альбо Койданаўскі раён ва ўзорны польскі. 31 мая – 9 чэрвеня 1931 г. Камісія ЦВК БССР наведала Койданаўскі раён і залічыла практычна ўсіх католікаў у палякі, давёўшы колькасць польскага насельніцтва да 43,7% (раённыя ўлады павялічылі гэты паказчык да 49,9%) [10, с. 147]. У лютым 1932 г. Бюро ЦК КП(б) Б звярнулася ў ЦК УКП(б) з просьбай ухваліць рэарганізацыю Койданаўскага (у далейшым – Дзяржынскага) раёна ў польскі, папярэдзіўшы аб тым, што патрэбны лік польскага насельніцтва быў атрыманы за кошт статыстычных маніпуляцый [4, арк. 5–12].

Пашпартызацыя 1933 г. паказала, што доля палякаў сярод жыхароў Дзяржынскага раёна складае ўсяго 24,8%. 26 ліпеня 1934 г. выйшла пастанова ЦК УКП(б) «Аб рабоце ЦК КП(б)Б і СНК БССР», у якой улады БССР былі абвінавачаны ў паланізацыі беларусаў. Летам 1934 г. Народны камісарыят асветы БССР дазволіў выкладаць польскую мову толькі ў польскіх школах і класах. Па выніках тэндэнцыйных абследаванняў насельніцтва большасці польскіх сельсаветаў было аднесена да беларусаў ці «былых палякаў» [5, арк. 173–187]. Абслугоўванне беларусаў-католікаў на польскай мове было аб'яўлена вынікам дзейнасці антысавецкіх сіл. Да канца 1930-х гг. у свядомасці прадстаўнікоў улад трывала замацаваўся знак тоеснасці паміж польскасцю і каталіцызмам. Так, 18 жніўня 1937 г. бюро ЦК КП(б)Б разгледзела пытанне «Аб мерах па закрыцці польскіх касцёлаў». У Хрыпялеўскім сельсавеце замест этноніма «палякі» ўжываўся эўфемізм «католікі» ў значэнні нацыянальнасці [8, арк. 1].

У сярэдзіне – канцы 1930-х гг. ва ўмовах перагляду канцэпцыі гісторыі народаў СССР афіцыйная прапаганда прызнала прагрэсіўную гістарычную ролю Праваслаўнай царквы ў гісторыі Беларусі. Новыя ідэалагічныя ўстаноўкі шмат у чым паўтаралі пастулаты заходнерусізму: «у XVі стагоддзі... вялася вялікая барацьба паміж праваслаўнай грэчаскай верай і верай рымскай, каталіцкай, якой трымаліюя польска-літоўскія захопнікі. Гэтая барацьба праваслаўных супроць каталіцызму, якая ўзнікла на чыста рэлігійнай глебе, з'яўлялася формай нацыянальнай барацьбы народа за сваю незалежнасць, бо барацьба была накіравана супроць польска-літоўскіх князёў, якія хацелі сілком навязаць беларускаму народу свае парадкі і звычаі, <…> польска-літоўскія паны і магнаты здзекаваліюя з беларускага і ўкраінскага народаў, з іх звычаяў і жыцця, яны прымушалі іх мяняць праваслаўную грэчаскую веру на каталіцкую» [3]. З'явіліюя артыкулы, у якіх знішчэнне культавых будынкаў ацэньвалася ў негатыўным ключы [2].

Такім чынам, у 1920-я – пачатку 1930-х гг. савецкая ўлада схілялася да абслугоўвання каталіцкага насельніцтва з невыразнай этнічнай самаідэнтыфікацыяй на польскай мове. У сярэдзіне 1930-х гг. была згорнута работа сярод беларусаў-католікаў на польскай мове. Адначасова дзяржаўная прапаганда прызнала станоўчую гістарычную ролю праваслаўнай царквы на беларускіх землях.

## Літаратура

1. Баліцкі, А. Аб беларускіх школах з польскім ухілам / А. Баліцкі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 4. – С. 73–75.

2. Васілевіч, І. І. Аб дрэнных кіраўніках і забытых музеях / І. І. Васілевіч // Літаратура і мастацтва. – 1939. – 23 ліп. – С. 4.

3. Ларчанка, М. Да пытання аб гісторыі старажытнай і пачатку новай беларускай літаратуры / М. Ларчанка // Літаратура і мастацтва. – 1938. – 16 лют. – С. 4.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 5568.
5. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 9149.
6. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 10917.
7. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 10969.
8. НАРБ. Фонд 42. Воп. 1. Спр. 2131.
9. НАРБ. Фонд 701. Воп. 1. Спр. 93.
10. Об организации польского национального района // Советское строительство. – 1932. – № 5. – С. 147.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова